# МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ АПАВЯДАННЯЎ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА 1920-Х ГГ.

***Дайлідзёнак К.В.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт*

Кузьма Чорны ўзбагаціў нашу нацыянальную прозу творамі, у якіх узнавіў шырокую карціну рэчаіснасці, стварыў незвычайныя чалавечыя характары, звярнуўся да вострых праблем таго часу і, адштурхоўваючыся ад гэтага, зрабіў глыбокія філасофскія абагульненні. Кузьма Чорны толькі яшчэ пачынаў сваю творчасць, а яго ўжо абвясцілі "беларускім Дастаеўскім". Пісьменнік добра ведаў, што для таго, каб стаць "Дастаемскім", узысці на такі вялікі ўзровень, перш за ўсё трэба выявіць у сваёй творчасці нацыянальны характар беларуса, стварыць нацыянальны раман і беларускі стыль. Менавіта Кузьма Чорны і лічыцца стваральнікам беларускай інтэлектуальна-філасофскай і сацыяльна-псіхалагічнай прозы.

Актуальнасць нашага даследавання заключаецца ў тым, што цікавасць да вялікай літаратурнай спадчыны Кузьмы Чорнага не змяншаецца, і яго творчасць пашырана разглядаецца ў сучасным літаратуразнаўстве. Важнасць апеляцыі да мастацкага вопыту адзначанага аўтара адчуваюць не толькі гісторыкі і тэарэтыкі літаратуры, але і пісьменнікі.

Мэта артыкула – выявіць мастацкія асаблівасці апавяданняў 1920-х гадоў К. Чорнага.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання выступаюць выбраныя апавяданні акрэсленага аўтара, у якіх больш яскрава прасочваецца індывідуальны творчы стыль. Даследаванне праводзілася з выкарыстаннем метадаў тэкстуальна-аналітычнага, канкрэтна-гістарычнага аналізу мастацкага твора.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Як і большасць пісьменнікаў, Кузьма Чорны пачынаў з маленькіх апавяданняў, рознай мастацкай якасці.

У час, калі Беларусь пачынала "разгортваць" масавы літаратурны рух, калі ў жыцціі самога народа адбываліся пэўныя змены, пачалі выходзіць лірычныя і бытавыя абразкі Кузьмы Чорнага. У гэты перыяд фарміраваўся стыль аўтара, фармаваліся характары персанажаў.

Раннія апавяданні Кузьмы Чорнага ў большасці напісаны ад першай асобы, "ад сябе". Часта ў іх перадаецца размова з народам, з простымі людзьмі, з якімі наратар пераважна сустракаецца ў дарозе.

Шматзначнасць вобраза дарогі узнікла і з-за таго, што асабістае жыццё М.К. Раманоўскага падобнае да вандроўкі. Яшчэ з маленства будучаму пісьменніку давялося з бацькам хадзіць па свеце і шукаць сабе працу, каб зарабіць на жыццё. Гэта шматварыянтна адбілася на яго творчасці.

Крытыкі, якія бачылі ў творах Кузьмы Чорнага толькі эмацыйна-паэтычны малюнак прыроды і вясковага жыцця, не заўважалі, што сам аўтар усё больш і больш стараўся адыходзіць ад гэтай плыні. Пісьменнік паступова выяўляў псіхалагічны аналіз, замацоўваў якасці аналітычнай і эпічнай прозы, але гэта яму давалася не так лёгка.

На гэту адметнасць яго абразкоў і апавяданняў звярнуў увагу Алесь Адамовіч, даследуючы станаўленне пісьменніцкага стылю. Ён пісаў: "У адрозненне ад многіх маладнякоўцаў, якія далей паэтызацыі знешніх прыкмет часу не ішлі, К. Чорны ўжо ў ранніх замалёўках сваіх задумваецца над складанымі пытаннямі і праявамі жыцця простага чалавека… Імкненне да паказу глыбінных працэсаў народнага жыцця, характэрнае для К. Чорнага ўсіх перыядаў, у ранніх апавяданнях выявілася ў паказе тых ледзь улоўных, але арганічных зрухаў у побыце і псіхалогіі чалавекапрацы, штоназіраліся ў вёсцы" [1, с. 14–19].

Трэба адзначыць, што ў ранніх апавяданнях відавочна прасочваецца талент пісьменніка-аналітыка, які ўсё больш імкнецца раскрыць свет чалавека, паказаць яго непаўторнасць.

Невялікі абразок "На пыльнай дарозе" паказвае нам сустрэчу героя з дванаццацігадовым хлопчыкам. Характар падлетка натуральны, рэалістычна сапраўдны. Прысутнічаюць праявы дзіцячых манер і адчуванняў: герой не шкадуе памершага айчыма-азіята, які прыносіў пакуты іх сям'і, клапоціцца пра сваю маці, якую яны, дзеці, яшчэ "нічым не пацешылі", і думае аб тым, што "хутка аўсы будзем сеяць".



Рэпазіторый ВДУ

Здаецца, што абразок напісаны мастацкімі штрыхамі, яле яны добра і поўна паказваюць характар героя, яскрава адлюстроўваюць яго душу, светлую, нескалечаную нягодамі жыцця ў сям'і айчыма.

Хочацца адзначыць, што ўсе апавяданні К. Чорнага вельмі простыя па сюжэце. Адсутнічаюць нечаканыя, складаныя сюжэтныя хады, але аўтар застаецца верным свайму прынцыпу – паказаць не вынік, а вялікі працэс развіцця характараў героя. Кузьма Чорны лічыў гэта самым важным у мастацкім творы.

Таму і першыя апавяданні Чорнага "На варце" і "На граніцы" былі падобныя да нарысаў, у іх ледзь прасочваецца сюжэт.

У трагічным апавяданні "На граніцы" размова ідзе пра беларускую дзяўчыну, што вывезлі ў панскую Польшчу. З цягам часу ёй удалося збегчы адтуль, гераіня пераходзіць граніцу. У дзяўчынкі дастаткова моцны характар, яна без значнай трывогі расказвае чырвонаармейцам пра свае пакуты і перажытыя здзекі.

Праз увесь адзначаны эпізод праходзіць апісанне вельмі дрэннага надвор'я. Аўтар памастацку перадаў увесь цяжар яе душы праз стан надвор'я, таму ў фінале, калі дзяўчына ўсё расказала, і ёй стала лёгка, надвор'е змянілася і стала цёплым. Пісьменнікам удала перадаецца лёгкасць яе душэўнага стану.

Як адзначаецца даследчыкамі, праз апавяданне-нарыс пісьменнік паказвае паслякастрычніцкую яву як "час новай думкі, новага жыцця, час новых людзей".

Вялікую колькасць такіх апавяданняў-нарысаў напісаў Кузьма Чорны, да іх можна аднесці: "Жалезны крык" (1924), "Быльнікавы межы" (1924), "Радасць жанчыны" (1925), "Срэбра жыцця" (1925), "Жаночая праўда і мужыцкая крыўда" (1925), "Дзядзькі поплаў мераюць" (1925) і інш.

Кузьма Чорны быў вялікім мастаком, які меў добрыя музычныя здольнасці, добра маляваў, займаўся акцёрскай дзейнасцю. У яго творчай дзейнасці гэта ўсё зліваецца ў адно цэлае. Гэтыя ўсе здольнасці дапамагалі аўтару перадаваць розныя характары, рэалістычна і псіхалагічна "ажывіць" у сваіх творах навакольны свет і чалавека, маляўніча апісваць усё тое.

Хочацца адзначыць, што апавяданне "Вераснёвыя ночы" з'яўляецца адным з лепшых у спадчыне не толькі Кузьмы Чорнага, але і ўсёй беларускай "малой прозы". Тут яскрава спалучаюцца выяўленне знешняга жыцця герояў з па-майстэрску раскрытымі чалавечымі характарамі. Пісьменніку добра ўдалося перадаць настрой і атмасферу навакольнга асяроддзя: "Маўчала восень у садах і агародах, мёдам пахла павольнае кананне кляновага лісця. Стукалі ў садзе аб зямлю яблыкі і грушы, спелі арабіны. Цякла пахам моцная мята. Асеннія мухі гулі каля сяней, сінія і вялікія... Вуліца была ціхаю, дрымотнаю" [2, с. 27], паказаць, як гэты прыродны стан уздзейнічае на адчуванні галоўнай гераіні Агаты.

Хочацца дадаць, што ва ўсіх творах Кузьмы Чорнага паказаны складаны духоўны, маральны, асобасны пошук. Чытаць творы Чорнага, нягледзячы на частыя займальныя, амаль дэтэктыўныя сюжэты, складана. Пісьменнік увесь час трымае чытачоў у напружанні, ён уважліва адлюстроўвае працэс пакутлівых пошукаў герояў. Гэта могуць быць пошукі сябе, свайго месца ў жыцці, імкненне разабрацца ў чалавечых стасунках, асэнсаванне нейкай канцэптуальнай ідэі.

**Заключэнне.** Адзначым, што творчасць Кузьмы Чорнага мела дастаткова вялікі ўплыў на развіццё нацыянальнай мастацкай свядомасці і літаратуры. Спадчына пісьменніка выключная па сваёй філасофскай і псіхалагічнай глыбіні. Аналізуемы аўтар не толькі вызначыў новы ўзровень мастацкага мыслення, шмат у чым непераўзыдзены нават да нашага часу, яго творчасць аказала значнае ўздзеянне на фармаванне светапоглядных асноў маральнага жыцця беларусаў увогуле.


1. Адамовіч, А. М. Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю Кузьмы Чорнага / А. Адамовіч. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1958. – 180 с.

2. Чорны, К. Збор твораў: у 8 т. Т.2. – Апавяданні 1928 – 1944 гг. / пад рэд. Ю. Пшыркова / К. Чорны. – Мінск: Маст. літ., 1972. – 488 с.


Репозиторий ВГУ